## 2025 г. - 285 гадоў з часу пабудовы Свята-Параскева-Пятніцкай царквы у аг. Дзівін (Кобрынскі раён, 1740), помніка народнага драўлянага дойлідства з рысамі стылю барока



Свята-Параскева-Пятніцкая царква ў аг. Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці мае багатую гісторыю. Пабудавана ў 1740 годзе (па іншых крыніцах - у 1728) на месцы храма, які адзначаны ў 1566 годзе, намаганнямі святара Яна Антонія Ваяводскага. Размешчана на цэнтральнай вуліцы вёскі (былая Кобрынская) алтаром на захад. Гэта адзін з нешматлікіх праваслаўных храмаў, які размешчаны алтаром на паўночны захад, бо па царкоўных канонах алтар заўсёды звернуты на ўсход.

Жыццё храма прасякнута легендамі. Адно паданне абвяшчае, што каралева польская і вялікая княгіня літоўская Ганна (вотчынніца мястэчка Дзівін) праязджала са сваёй дачкой праз Дзівін. У дарозе дзяўчынка захварэла, і Ганна дала абет - пабудаваць тут царкву, калі яе дачка ачуняе. Дачка паправілася, і царква была пабудавана з круглых сасновых бярвенняў, аб чым выдана грамата, зацверджаная ў Брэсцкім ваяводстве. Існуе таксама легенда, што рускі палкаводзец А. В. Сувораў пасля лёсавызначальнага бою пад Дзівінам (1794) маліўся і для яго служыўся малебен у гэтай невялікай драўлянай царкве. Паводле некаторых звестак, бываў у храме і Тадэвуш Касцюшка.

За свой доўгі век царква не аднойчы перабудоўвалася. У 1869-1870 гадах будынак перароблены паводле распрацовак інжынера Чэкмасава і архітэктара Барташэўскага: зроблены прытвор, пастаўлены груваcткі купал на светлавым барабане. Абноўлены храм ва ўсёй красе паўстаў перад прыхаджанамі, накіраваўшы ўверх дзве чатырохкутныя вежы з гранёнымі главамі. У другой палове XIX стагоддзя да царквы прыбудаваны ўваходны тамбур, які перарэзаў галерэю, зроблены разьбяныя ліштвы, двух’ярусная каркасная званіца (васьмярык на чацверыку) завершана высокім шатром.

З 1876 года па 1884 год па ўказе Сінода храм Параскевы-Пятніцы быў прыпісным да Успенскага, які пабудаваны ў Дзівіне ў 1870 годзе. У 1886 годзе царкву капітальна

адрамантавалі. Рамонты і перабудовы былі таксама ў 1892—1895 гадах і ў 1899 годзе.

У час Першай сусветнай вайны будынак царквы пашкоджана пажарам, але нязначна. Царква на два гады стала казармай для кайзераўскіх салдат. У 1917 годзе пачаліся аднаўленчыя працы, скончаныя ў 1919 годзе.

Служба ў храме вялася, пакуль у «хрушчоўскую адлігу» не павесілі на царкву замок на цэлых 30 гадоў. 6 жніўня 1962 года рэлігійнае аб'яднанне знялі з рэгістрацыі, а царкву — з уліку дзеючых. Было вырашана прыстасаваць будынак пад клуб, аднак у выніку ён выкарыстоўваўся як склад і паступова прыходзіў у заняпад. Да закрыцця ў храме захоўваліся іконы «Святой Ануфрий в пустыне» і «Вознесение», якія належалі пэндзлю польскага іканапісца XVIII стагоддзя Томаша Міхальскага. Цяпер гэтыя абразы знаходзяцца ў Музеі старажытнай беларускай культуры ў Мінску.

У 1990 годзе, пасля рэгістрацыі праваслаўнай суполкі, храм аднаўляўся па праекце і пад кіраўніцтвам Георгія Канстанцінавіча Маразевіча. У рамонце храма прымалі ўдзел жыхары Дзівіна, Осы, Барысаўкі. Старажыл вёскі, краязнаўца Афанасій Мікіціч Гапановіч, ахвяраваў храму званы. Царква асвячона ў 1992 годзе архіепіскапам Брэсцкім і Кобрынскім Канстанцінам.

Царква драўляная, з дрэва выканана і асобная званіца. Сцены вертыкальна абабітыя дошкай. Будынак двухзрубная, складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і пяцігранна́й апсіды з 2 прыбудоўкамі. Інтэр'ер храма зальны: два стэнды ля ўвахода падтрымліваюць хоры. Акцэнт у кампазіцыі зроблены на галоўным фасадзе, які завершаны 2 чацверыковымі вежамі з фігурнымі яруснымі купаламі і цыбулепадобнымі купалкамі. На вышыні даху ў вежах зроблены франтальныя прамавугольныя вокны-праёмы, закрытыя жывапіснымі абразамі святых. У інтэр'еры захаваўся іканастас 1830-х гадоў.

Свята-Параскева-Пятніцкая царква - помнік архітэктуры, які спалучае будаўнічыя прыёмы мясцовага драўлянага дойлідства з элементамі барока. Храм унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Разглядалася пытанне аб уключэнні двухвежавай царквы

Параскевы Пятніцы са званіцай у в. Дзівін у спіс Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

На сённяшні час царква дзейнічае, настаяцель - пратаіерэй Мікалай Аляксандравіч Гляд. Прастольнае свята - 10 лістапада. Архітэктурны помнік нагадвае пра колішні росквіт Дзівіна, які ўпершыню згадваецца ў 1466 годзе, а прыгажосць царквы надоўга застаецца ў памяці.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 6. – С. 111-112.

**Дивинская** церковь Параскевы Пятницы // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1 Брестская область. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 323-324 : фот.

**Дивинская** церковь Параскевы Пятницы // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. – Минск, 2006. – Т. 3. – С. 373-374 : фот.

**Габрусь, Т. В.** Дзівінская царква Параскевы Пятніцы / Т. В. Габрусь // Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. - Мінск, 1993. - С. 194 : фат.

**Габрусь, Т. В.** Дзівінская царква Параскевы Пятніцы / Т. В. Габрусь // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 292.

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 3. – С. 394.

**Дивинская** Свято-Параскево-Пятницкая церковь // Туристская энциклопедия Беларуси. – Минск, 2007. – С. 173.

**Кулагін, А. М.** В. Дзівін, Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці. Свята-Параскева-Пятніцкая царква / А. М. Кулагін // Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. – Мінск, 2001. - С. 71-72 : фат.

**Алисейчик, В. В**. Церковь Параскевы Пятницы : [д. Дивин] / В. В. Алисейчик // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 255-256 : фот.

**Алісейчык, У. В.** Царква Параскевы Пятніцы : [в. Дзівін] / У. В. Алісейчык // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 231-232 : фат.

**Церковь** святой великомученицы Параскевы Пятницы // Храмы Брестчины. – Брест, 2024. - С. 120 : фот.

**Мароз, В. В.** Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. Мароз. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. - 511 с., [40] л. іл. - Гл. на с. 118, 283, 332.

**Кулагін, А. М**. Драўлянае царкоўнае дойлідства : Свята-Параскева-Пятніцкая царква ў в. Дзівін / А. М. Кулагін // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 463-464 : фат. (Архітэктурная спадчына Кобрыншчыны).

**Гапанович, А. Н.** Памятники архитектуры. Свято-Параскева-Пятницкая церковь / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. – С. 36 : фот.

**Габрусь, Т. В.** Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – 318 с. : іл. - Гл. на с. 167-168.

**Свята-Параскева-Пятніцкай** царкве ў в. Дзівін (1740) – 285 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 186.

**Дзівін.** Свята-Параскева-Пятніцкая царква // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 49 : фат.

**Свята-Параскева-Пятніцкая** царква // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 17-18 : фат.

**Старонка мая – непаўторны куток** : буклет да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін / ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук, камп. афармл. П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2016.

**Зарэцкая, К.** Тая, што бачыла гісторыю / Ксенія Зарэцкая // Культура. - 2023. — 15 красавіка (№ 15). — С. 14 : фат.

Гісторыя царквы Святой Параскевы Пятніцы аг. Дзівін Кобрынскага раёна.

**Елизарова, Ж.** Дивин древний, Дивин юный. Таямніцы зямлі кобрынскай / подготовила Жанна Елизарова ; по матералам интернет-порталов «Познай Кобрин», «RETRO-КОБРИН-CITY», библиотеки УК «Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова», Дивинского филиала ГУК «Кобринская ЦБС», ГУК «Дивинский центр культуры и досуга», Дивинского Дома ремесел // Кобрынскі веснік. – 2022. – 23 сакавіка (№ 21). – С. 4-5 : фот.

**280-летие** со дня освящения храма в аг. Дивин / по материалам pravbrest.by // Кобрин-информ. - 2020. — 19 ноября (№ 47). — С. 11 : фот.

280-летие со дня освящения храма вмч. Параскевы в аг. Дивин.

**Гневушева, А.** Храмы Брестчины — в Список ЮНЕСКО / Алена Гневушева // Заря. - 2017. — 18 ноября. — С. 4.

Церковь Параскевы Пятницы в Дивине могут включить в Список Всемирного наследия ЮНЕСКО.

**Строк, В.** Культурны ракурс / Вера Строк // Літаратура і мастацтва. - 2017. — 31 сакавіка. — С. 16.

Драўляную царкву Параскевы Пятніцы са званіцай у в. Дзівін плануецца ўключыць у спіс Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

**В список** ЮНЕСКО // Кобрынскі веснік. - 2016. — 1 кастрычніка. — С. 12.

Церковь Параскевы Пятницы со звонницей агрогородка Дивин предполагается внести в список Всемирного культурного наследия.

**Ефціфеева, Н.** Званы для Параскевы / Наталля Ефціфеева // Кобрынскі веснік. - 2016. — 2 лістапада. — С. 2.

Жыхар аг. Дзівін А. Гапановіч падарыў званы для мясцовай царквы Святой Параскевы Пятніцы.

**Козлович, В.** Старое лучше нового / Валентина Козлович // Советская Белоруссия. - 2015. — 11 апреля. — С. 7.

В списке всемирного наследия ЮНЕСКО могут оказаться пять православных храмов области, в числе их - церковь Параскевы Пятницы в Дивине.

**Марчук, Н**. Православные храмы Дивина / Нина Марчук // Кобрин-информ. - 2014. — 16 октября. — С. 11.

Православные храмы Дивина, как ныне существующие, так и ушедшие в небытие, представляют немалый интерес.

**Шаўчук, А.** Храмы Кобрыншчыны: у вёсках Гарадзец, Дзівін, Кісялёўцы / А. Шаўчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 6 снежня. – С. 3.

**Адноўлены** храм у сяле Дзівін: царква Вялікапакутніцы Пятніцы // Кобрынскі веснік. – 1992. – 15 жніўня. – С. 1.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Дзівін

***Помнікі:***

Дзівінская Параскева-Пятніцкая царква

***Прадметы:***

Цэрквы

Помнікі культавай архітэктуры